# Зялёная ваенная здзелка для Еўропы, каб выратаваць свет

Я магу сказаць, што, хоць ужо і маючы невялікую зацікаўленнасць, маё падарожжа ў палітыку па-сапраўднаму пачалося ў 2014 годзе, калі я сядзеў прыкаваны да тэлевізара і YouTube: гадзіны за гадзінамі глядзеў кадры Еўрамайдану, уражаны і натхнёны адвагай простых людзей, якія так моцна жадалі лепшай будучыні для сябе і сваіх сем'яў, што біззбройныя і ўразлівыя стаялі супраць смяротных атрадаў Беркута. Аднак прылівы і адлівы гэтага пераўтваральнага палітычнага руху былі раптоўна перапыненыя неймаверным – першым расійскім уварваннем ва Украіну з масай салдат, якія хлынулі ў гарады краіны, і танкамі, якія імчалі па ўкраінскіх дарогах. Для наіўнага падлетка гэта былі эмацыянальныя арэлі, якія дапамаглі па-сапраўднаму зразумець суровыя рэаліі свету. Міжнародная супольнасць сядзела і глядзела, як гэта адбываецца, пагразіла пальцам і... нічога. Абсалютна нічога. Я змірыўся з тым, што мая краіна, Латвія, ды і Еўропа ў цэлым ніколі не будуць у бяспецы з такім суседам, як Расія.

24 лютага 2022 года стала трывожным званком для многіх, хто дагэтуль не звярталі ўвагі. Перад тым лідараў з Усходняй Еўропы і краінаў Балтыі іх заходнія калегі і каляжанкі часта называлі русафобамі, параноікамі і істэрыкамі. «Яны проста не змаглі пераадолець сваё траўматычнае савецкае мінулае», — думалі многія. «Расія цяпер іншая краіна і існуе ў іншую эпоху, якая вызначаецца ўзаемавыгаднымі палітычнымі і эканамічнымі сувязямі; яна проста спрабуе жыць сваё жыццё, захоўваючы свой нацыянальны гонар», — часта дадавалі яны. Гэта быў так званы «рацыянальны Захад», які мог пасадзіць Расію за стол перамоваў і захаваць мір, часам коштам некаторых саступак былой супердзяржаве, такіх як «дараванне» незаконнай анэксіі ўкраінскага Крыма. У рэшце рэшт, навошта Расіі ісці да канца і рызыкаваць страціць сваё месца ў міжнароднай сістэме, якая прынесла ёй столькі карысці?

Адказ заўсёды быў відавочным для тых, хто ведае Расію па сваёй нацыянальнай гісторыі і сваім штодзённым жыцці. Гэта не партнёр, які шукае ўзаемнай выгады. Дух агрэсіўнага шавінізму і пачуццё перавагі і бязмежных правоў пранізваюць усю расійскую культуру зверху да нізу. Гэта рэвізіяністкая ўлада, якая імкнецца быць на вяршыні іерархіі, вызначаць адносіны на сваіх уласных умовах і заўсёды прытрымлівацца аднаго боку. Усё гэта не павінна нікога здзіўляць. У шчаслівыя моманты да 2008, 2014 і нават да 2022 года, насалоджваючыся дзесяцігоддзямі адноснага глабальнага міру, многія адчувалі, што вайна была з'явай далёкага мінулага. Аднак гэтыя дзесяцігоддзі адноснага міру наступілі пасля пераважнай перамогі Захаду ў халоднай вайне і падтрымліваліся амерыканскай гегемоніяй (і, скажам шчыра, пэўнай ступенню імперыялізму), а не ўсеагульнай згодай паміж сусветнымі лідарамі жыць у вечным міры. Ва ўсялякім разе, існавалі ўсеагульныя рознагалоссі, пра што сведчыць, напрыклад, прамова расійскага дыктатара ў 2007 годзе на Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы, на якой ён наракаў на дамінаванне Злучаных Штатаў у глабальных справах.[1]

Такім чынам, цалкам лагічна, што гады відавочнай слабасці Захаду – такія як абранне Дональда Трампа, рост жадання скасаваць Арганізацыю Паўночнаатлантычнага дагавора (NATO) (у тым ліку ў руху зялёных), рост прарасійскіх сілаў па ўсёй Еўропе і ў Злучаных Штатах і няздольнасць пакараць Расію за першае ўварванне ва Украіну – падбадзёрылі Расію наўпрост кінуць выклік заснаванаму на правілах міжнароднаму парадку, на які так часта скардзіўся Пуцін. Асабліва пасля ягонага выступу ў 2007 годзе, які цяпер некаторыя разглядаюць як прадвесце расійскай імпэрскай агрэсіі. Яны заўсёды лічылі сябе прайграўшымі ў халоднай вайне, а ваенны злачынец Пуцін адкрыта гаварыў пра гэта, называючы распад СССР «найвялікшай геапалітычнай катастрофай стагоддзя».[2] Такія настроі падзяляе значная частка насельніцтва Расіі, паводле штогадовага апытання «Левада-Цэнтра». Тым не менш, Еўропа не была гатовая прызнаць непазбежнае сутыкненне светаў, яна нават не змагла

абараніць свой уласны – дэмакратычную дзяржаву, якая імкліва рэфармуецца і імкнецца да еўрапейскай інтэграцыі – і змарнавала столькі намаганняў на тое, каб быць добрай да Расіі, якая цяпер выкарыстоўвае вялікую частку гэтай бессэнсоўнай добрай волі, у тым ліку выгады ад эканамічнага супрацоўніцтва і ваеннага развіцця, каб абсыпаць Украіну беспілотнікамі і ракетамі.

На жаль, наш ідэалістычны зялёны рух таксама быў уведзены ў зман. Усведамляючы шкоду, прычыненую амерыканскай гегемоніяй, каланіяльным мінулым і неакаланіяльнымі плынямі шматлікіх краінаў-чальцоў НАТА і Еўрапейскага саюза, і абапіраючыся на антываенныя карані, многія ўдзельнікі ды ўдзельніцы (маладых) зялёных рухаў абралі пацыфізм і пачалі заклікаць да ліквідацыі НАТА, а таксама аднабаковае ядзернае раззбраенне нават у 2022 годзе, нягледзячы на тое, што самі ж сталі сведкамі расійскага ўварвання ў Грузію ў 2008 годзе і першага расійскага ўварвання ва Украіну ў 2014 годзе. Хоць і трывожны званок 24 лютага 2022 года стаў эфектыўным для многіх, дагэтуль ён не стаў усеагульным. Украіне і яе бліжэйшым саюзнікам прыйшлося змагацца гадамі, каб атрымаць доступ да абсталявання, транспартных сродкаў і тэхналогій, якія лічацца важнымі для сучаснай арміі: напрыклад, асноўныя баявыя танкі, сістэмы супрацьпаветранай абароны, самалёты і крылатыя ракеты. Усё яшчэ вялікая частка пералічанага была атрымана ў абмежаваных колькасцях, недастатковых для паўнавартаснай абароны. Некаторыя зялёныя рухі ініцыявалі заклікі цалкам узброіць Украіну для яе абароны ад генацыднага захопніка, у той час як некаторыя ўпарта трымаліся сваіх пацыфісцкіх каранёў, не разумеючы ключавой праблемы сваёй веры – кожны, хто мае армію, можа забраць іх каштоўнасці і ўвесь іх свет.

Было б наіўна сцвярджаць, што мы знаходзімся ў тым месцы і часе, дзе нашыя зялёныя каштоўнасці знаходзяцца ў бяспецы і ахове. Што мы можам проста скласці зброю, адмовіцца ад ваеннай прамысловасці і абвясціць сусветны мір. Усё ў свеце паказвае на адваротнае. Расія, каб спыніць рух Украіны да еўрапейскай інтэграцыі, развязала жорсткую генацыдную вайну такога маштабу, якога на еўрапейскім кантыненце не было з часоў Другой сусветнай вайны; у той жа час Азербайджан здзейсніў этнічную чыстку супраць армян з ашаламляльнай хуткасцю і практычна без міжнароднага супраціву. Паралельна на Блізкім Усходзе дзесяцігоддзямі адбываюцца жорсткія трагедыі: у Палестыне, Емене, Сірыі, Іраку і іншых месцах. Кітай узмацняе ваенную агрэсію супраць Тайваня, рыхтуючыся да магчымага ўварвання. Краіны па ўсім свеце адступаюць ад дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона, а аўтарытарныя рэжымы растуць як грыбы пасля дажджу. Нават у Еўрапейскім саюзе, супольнасці таго, што мы раней лічылі агульнымі дэмакратычнымі каштоўнасцямі, такія краіны, як Венгрыя, адкрыта лабіруюць інтарэсы пуцінскага генацыднага аўтарытарнага рэжыму і паступова дэмантуюць апошнія кавалкі венгерскай дэмакратыі. Ні адно з гэтых пытанняў не будзе вырашана з нерашучым Еўрапейскім саюзам, які адмаўляецца фармаваць глабальную палітыку і рыхтавацца да выклікаў, якія могуць быць вырашаны не дыпламатыяй, а канфрантацыяй.

Гэта, канешне, не азначае, што Еўрапейскі саюз павінен шукаць канфрантацыі, але ж хутчэй самаабароны і стрымлівання – шляхам хуткага развіцця і мабілізацыі свайго палітычнага, эканамічнага і ваеннага патэнцыялу, каб паказаць дыктатарам-забойцам у Маскве, Пекіне, Тэгеране, Пхеньяне (альянс, які зараз уцягнуты ў генацыд супраць Украіны) і ў іншых месцах, што еўрапейскія каштоўнасці – гэта не проста пустыя словы ў прыгожа напісаных маніфестах, а хутчэй стабільная і магутная сістэма, здольная абараніць сваё. Навучыўшыся на памылках амерыканскіх спробаў «кіраваць» заснаваным на правілах міжнародным парадкам, Еўропа можа паставіць прагрэсіўныя, феміністкія, зялёныя каштоўнасці ў цэнтр сваёй глабальнай дыпламатыі, каб стаць сапраўднай сілай дабра, але, калі сітуацыя даходзіць да кіпення, быць гатовай узбройвацца, абараняць ахвяр і змагацца з агрэсарамі без ваганняў. Менавіта ўсведамленне таго, што дзеянні маюць наступствы, у першую чаргу спыняе агрэсараў, і менавіта адсутнасць наступстваў, такая як вышэйзгаданая слабасць Захаду ў дачыненні да Расіі, стварае стымул працягваць выпрабоўваць ваду, пакуль мы не прыйдзем да канчатковай станцыі – поўнай вайны.

Тое, як мы, спадзяюся, паспрабуем вырашыць гэтыя няўдачы міжнароднай сістэмы, будзе вызначаць кірунак прагрэсу чалавецтва на працягу наступных стагоддзяў. Ці могуць вялікія краіны змяняць межы сілай, ці могуць малыя краіны клапаціцца пра сябе, не падпарадкоўваючыся капрызам вялікіх краінаў,

ці маюць падпісаныя дагэтуль дамовы – па ўсім, ад правілаў вайны да гандлю – хоць якое значэнне, ці вітаюцца змены і ці не душацца яны жорсткімі дыктатарамі-забойцамі? Для нас, зялёных у Еўропе, Еўрапейскі саюз як актыўная глабальная палітычная, эканамічная і ваенная сіла з'яўляецца адзіным шанцам не толькі абараняць нашы каштоўнасці тут дома – у маёй Латвіі, ва Украіне ці дзе-небудзь яшчэ ў Еўропе – але і ва ўсім свеце. Кліматычны крызіс зменіць не толькі Еўропу, таму мы павінны адыграць пэўную ролю ў клопаце пра ўсё чалавецтва на будучым складаным шляху.

**Рычардс Аланс Міезіціс**